# У космасе—савецкі чалавек!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 12 (443) | Субота, 15 красавіка 1961 г. | Цана 1 кап.

**12 красавіка 1961 года ў 10 гадзін 55 мінут касмічны карабель-спадарожнік „Усход“ з чалавекам на борце зрабіў пасадку ў зададзеным раёне Савецкага Саюза.**

## 7-я студэнцкая

Чарговая, сёмая студэнцкая навуковая канферэнцыя Прыбалтыкі і Беларускай ССР праходзіла ў Рызе. Тут сабраліся студэнты 22 вышэйшых навучальных устаноў краіны, каб абмяняцца сваімі навуковымі дасягненнямі і падзяліцца вопытам у мэтах далейшага паляпшэння работы. На канферэнцыі было прадстаўлена больш 250 дакладаў па розных галінах навукі і тэхнікі.

Работа канферэнцыі праходзіла па секцыях, сярод якіх былі — фізіка-матэматычная, хімічная, а таксама секцыя грамадскіх навук і іншыя. Усяго—13 секцый.

Ад Мінска на гэтай канферэнцыі прысутнічалі студэнты чатырох ВНУ: палітэхнічнага інстытута, БДУ, інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і лесатэхнічнага інстытута.

У складзе дэлегацыі універсітэта было сем чалавек — прадстаўнікі фізічнага, матэматычнага і гістарычнага факультэтаў. Усе яны прывезлі ў Рыгу цікавыя, змястоўныя даклады, плён сваёй доўгай і крапатлівай працы. Так, студэнт фізічнага факультэта В. Ткачоў выступіў з дакладам на тэму: «Уздзеянне таўшчыні слою паўправадніка на фота ЭДС венцельнага элемента ў патоку рэнтгенавых промняў», дзе эксперыментальна ўстаноўлена залежнасць фота ЭДС, якая ўзнікае ў венцельным селенавым элеменце пры абпраменьванні рэнтгенаўскімі промнямі, ад таўшчыні слою селена. Устаноўлена аптымальная велічыня слою, паказана суадносіна знойдзенага значэння таўшчыні слою селена даўжыні дыфузійнага змяшчэння насьбітаў зарада.

Паспяхова выступілі студэнткі А. Зяцькова і З. Янусік. Іх даклад «Уздзеянне трэціх кампанент на адносную інтэнсіўнасць аналітычных пар ліній волавахрома і кальцыя-медзі» прызнаны настолькі цікавым, што атабраны для надрукавання ў зборніку студэнцкіх навуковых работ канферэнцыі.

З дакладамі на матэматычныя тэмы выступілі студэнты О. Савельеў і Р. Левіцін.

Канферэнцыя з'явілася не толькі шырокай трыбунай для абмену вопытам, дасягненнямі. Яна сыграла таксама вялікую ролю ва ўстанаўленні цесных сувязей паміж ВНУ краіны, умацаванні сяброўскіх адносін паміж студэнтамі нашых рэспублік.

На гэтай канферэнцыі прысутнічала 1235 студэнтаў. Паслухаць даклады прыходзілі выкладчыкі. З 237 прачытаных дакладаў 87 атабраны для надрукавання ў розных зборніках і часопісах.

Вялікіх паспехаў дабіліся і студэнты нашага універсітэта. З шасці прадстаўленых дакладаў чатыры атабраны для надрукавання. Гэта даклады студэнтаў фізічнага факультэта В. Ткачова, З. Янусік, студэнта матфака О. Савельева і В. Кардымона (гістфак).

У заключэнне неабходна адзначыць і некаторыя недахопы. Шкада, што ў Рыгу паехала усяго сем чалавек, у той час як БПІ паслаў сорак дзевяць. Сярод дэлегатаў ад універсітэта не аказалася прадстаўнікоў хімічнага, геаграфічнага, юрыдычнага факультэтаў. Ні аднаго даклада не прадставілі кафедры палітэканоміі і філасофіі.

Неабходна выправіць гэтую памылку і яшчэ лепш падрыхтавацца да наступнай канферэнцыі, якую намечана правесці ў Мінску.

**А. ЕЛСУКОЎ,**
**студэнт III-га курса гістфака.**

## ГОЛОС ИЗ КОСМОСА

**Люди! Вы слышите?—голос из Космоса,**
**Из нового Космовека!**
**Сегодня Космос принял гостя—**
**Советского человека.**

**Угрюмый Космос молчал веками.**
**Космос не любит гостей,**
**Но если гость с такими руками,**
**Как руки страны моей,—**

**Редеют тучи космической пыли,**
**Светлеет путь советской ракеты,**
**Становится сказка чудесной былью.**
**Слава тебе, Страна Советов!**

**Г. ЛЕВИНА,**
**студэнтка 2 курса біяфака.**

### ФАНТАСТЫЧНА!

Нам выпала вялікае шчасце быць сучаснікамі грандыёзных поспехаў, велізарных дасягненняў генія чалавека. Першы рэйс у космас зрабіў наш суайчыннік, і людзі ўсяго свету вітаюць яго, Чалавека Савецкай Расіі. Поўняцца сэрцы гонарам за сваю Радзіму, за наш народ, за нашага першага касманаўта!

Толькі ва ўмовах нашай сацыялістычнай дзяржавы магчымы такі велічны рух наперад. Здаецца, зусім нядаўна мы радаваліся першаму штучнаму спадарожніку Зямлі. Сёння ж наша касмічная тэхніка зрабіла гіганцкі крок наперад. Усе радыёстанцыі свету на розных мовах перадалі ў эфір вестку аб фантастычных поспехах рускіх, аб першай трасе міжпланетных зносін. Расія зноў наперадзе!

Сапраўды казка становіцца явалю! Слава савецкаму чалавеку! Слава табе, першы касмічны штурман, герой нашага часу Юрый Аляксеевіч Гагарын!

**А. ФУРЫК,**
**студэнт аддз. журналістыкі.**

### ДАЛЁКАЕ СТАЛА БЛІЗКІМ

Тое, што адбылося 12 красавіка, не магло не ўскалыхнуць чалавечае сэрца. Савецкі касманаўт перамог касмічную прастору!

Ведаю: патрабаваліся вялікія намаганні, бяспрыкладная праца, а таксама мужнасць савецкіх інжынераў і тэхнікаў, каб здзейсніць запаветную мару чалавецтва. І ўсё ж яна здзейснена! Піянер-касманаўт—грамадзянін Саюза ССР.

Веру, спадзяюся, чакаю: не сёння—заўтра знаёмы голас дыктара зноў аб'явіць радасную вестку: савецкі чалавек пракладвае трасу да новай планеты!

**Прафесар І. З. ФІШАР.**

### НОВАЯ ТРАСА МІРУ

*Здзейснілася яшчэ адно цуда айчыннай навукі і тэхнікі—адважны савецкі лётчык Юрый Аляксеевіч Гагарын праклаў першую трасу ў космас.*

*Шчыра кажучы, мы, стаіўшы хваляванне, чакалі гэтага дня і горача верылі ў тое, што ён вось-вось настане. І ўсё ж новы трыумф савецкай навукі — справа сапраўды фантастычная. Яна прыводзіць у захапленне ўвесь свет, а нам, савецкім людзям, усяляе надзею, што не за гарамі той час, калі неабсяжную сонечную сістэму спаласуюць новыя трасы. І ўсе яны будуць толькі трасамі міру.*

**В. А. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ,**
**дацэнт, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі.**

### ХВАЛЮЮЧЫ ПОСПЕХ

**Гэта збылося! Савецкі чалавек пабываў у космасе. Назва касмічнага карабля «Усход» і імя яго пілота Юрыя Аляксеевіча Гагарына будуць назаўсёды ўпісаны ў гісторыю чалавецтва.**

**За першым крокам, заўсёды самым цяжкім, з'явяцца новыя, усё больш вялікія і цікавыя. Я веру, што хутка савецкі чалавек ступіць на іншую планету і раскажа чалавецтву аб яе загадках і таямніцах.**

**М. А. ЯРАВІКОЎ,**
**загадчык кабінета палітэканоміі.**

## НЯХОДЖАНЫМІ СЦЕЖКАМІ СУСВЕТУ

Аб гэтым здаўна марылі людзі. І вось! 12 красавіка 1961 года явалю стала запаветная мара чалавецтва. Першым зрабіў гэты подзвіг савецкі чалавек Юрый Аляксеевіч Гагарын.

Бясконца ўсхвалявала вестка аб палёце чалавека ў космас усіх выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ул. І. Леніна. Як толькі радыё перадало першае паведамленне, у фае біякорпуса пачалі вывешвацца афішы, у якіх расказвалася аб усіх этапах палёту.

Пасля лекцый студэнты сабраліся на мітынг у самай вялікай аўдыторыі ўніверсітэта. Але сёння яна не магла ўмясціць усіх жадаючых. Студэнты стаялі ў праходах, у калідоры.

Мітынг адкрывае сакратар парткома БДУ Рыгор Васільевіч Булацкі.

—Першы рэйс у космас,—сказаў ён,—з'яўляецца самай выдатнай падзеяй нашых дзён. Мы законна ганарымся тым, што першым ступіў на няходжаную сцежку Сусвету наш суайчыннік, просты савецкі чалавек Юрый Аляксеевіч Гагарын.

Начальнік візуальнай станцыі па назіранню за штучнымі спадарожнікамі Зямлі Станіслаў Антонавіч Пахута напомніў словы К. Э. Цыялкоўскага, які гаварыў, што чалавек не застанецца вечна ў сваёй калысцы—на Зямлі, а будзе паступова пранікаць у бясконцую сусветную прастору.

—Мы з'яўляемся сведкамі здзяйснення гордай мары вялікага вучонага.

Аб тым, што здарылася 12 красавіка, цяжка гаварыць простымі абыдзёнымі словамі. У памяці усплываюць словы Уладзіміра Маякоўскага:

Как бедна
у мира
слова мастерская!
Подходящее
откуда взять?

Так надзвычай усхвалявана і горда прагучэлі на мітынгу словы дацэнта Калішэвіча, студэнтаў Бяркоўскага, Моткіна, Валмянскага.

А Святлана Макарэвіч, студэнтка чацвёртага курса фізічнага факультэта, сказала, што яе з сяброўкамі незвычайная навіна застала за разлікамі ў лабараторыі.

Ад імя ўсіх выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ул. І. Леніна прысутныя накіравалі прывітальную тэлеграму ў Маскву—Мікіце Сяргеевічу Хрушчову і першаму касманаўту Юрыю Аляксеевічу Гагарыну.

## Дарога толькі пачынаецца

ПІСЬМЫ З ПРАКТЫКІ

*Над дзвярыма вісіць акуратна аформленая шыльдачка: «Рэдакцыя Старобінскай раённай газеты «Савецкі патрыёт». Адчыняю дзверы і ўваходжу ў невялікі калідорчык. Другія дзверы замкнуты. Гадзіннік паказвае без дзесяці дзевяць. Ні душы...*

*Калі да пачатку работы застаецца адна мінута, з'яўляецца першая ластаўка. «Ластаўка» гэта год трыццаці пяці, досыць высокага росту, у дэмісезонным паліто і кавалерыйскіх галіфэ. Знаёмімся. Перада мной—Міхаіл Сідаравіч Барташэвіч.*

*— Падмога? Даўно чакалі! — Міхаіл Сідаравіч адчыняе дзверы і прапускае мяне ўперад.*

*Барташэвіч распранаецца, прычэсвае прыгожыя валасы і, кінуўшы мне: «Пасядзі, рэдактар хутка прыдзе», адразу бярэцца за розныя паперкі: ён загадвае аддзелам пісьмаў, культуры, спорту і яшчэ чымсьці, таму работы ў яго па вушы.*

*Сяжу ціхенька, чакаю.*

*Мінута дзесятага. З'яўляецца малажавы чалавек у ватнай тужурцы. «Мабыць селькор», — думаю. Аказваецца, Васіль Пракопавіч Круглік—літаратурны работнік рэдакцыі. Круглік невысокі, рухавы.*

*Потым прыходзіць намеснік рэдактара Фёдар Антонавіч Скрыган. Скідае паліто і адразу робіцца падобным на раённага работніка, такім, як у фільмах пра калгаснае жыццё. Сіняя гімнасцёрка, такога ж колеру прасторныя галіфэ, бліскучыя боты. Плотную фігуру намесніка цесна перацягвае камандзірскі пояс з зорачкай.*

*Хутка з'яўляецца загадчык сельгасаддзела Павел Барoдка, за ім сакратар газеты Уладзімір Максімавіч Новік. Год яму каля трыццаці пяці, а вочы вялікія, юнацкія, разумныя.*

*Кожны ўваходзячы прыветліва знаёміцца і гаворыць адно і тое ж, прыкладна:*

*— А-а, папаўненне? Даўно чакалі!*

*Барташэвіч падае мне на стол кіпу пісем. Я распранаюся, ямчэй усаджваюся на крэсле—і з галавой ныраю ў пісьмы рабселькораў.*

*Барташэвіч бегла прачытвае маю апрацоўку, дзе-ні-дзе падпраўляе, і аддае машыністцы Лізавеце Якаўлеўне.*

*Пісьмы пад маім пяром становяцца зусім непадобныя на арыгінал, хоць стаў свой подпіс, хаця я імкнуся і захаваць стыль аўтара, як навучылі ва ўніверсітэце. Барташэвіч супакойвае: «Нічога, абы сэнс быў захаваны»... Нашы сталы насупраць, і мы часта перакідваемся двума-трыма словамі.*

*У кабінеце рэдактара збіраецца планёрка. Даюць заданні. Сяджу на канапе, маўчу. Толькі слухаю, назіраю.*

*— А Патапаў? — раптам успамінае намеснік рэдактара Скрыган. — Дайце ж яму заданне!*

*— Угу, праграмачка ў яго... сем вёрст да нябёс, — устаўляе слова і мой кіраўнік Новік. — Злятай ты, браце, у Салігорск, глянь там на агітпункт — што там і як. Ды і напішы.—І Новік умомант адводзіць у макеце газеты месца для «мяне». Нахаду і загаловак патрэбны знаходзіць— «Вечарам на агітпункце». (Наогул, Новік можа ў імгненне вока прыдумаць загаловак, змакеціраваць газету, напісаць фельетон. Ен выхаванец Ленінградскага ўніверсітэта, працуе ў газеце ўжо даўно, і я яму па-добраму зайздрошчу).*

*Планёрка канчаецца, і кожны зноў прымаецца за сваю справу. Круглік і Бародка паехалі на раён. А я бяруся апрацоўваць артыкул. І заўважаю краем вока, адчуваю, што за мною неўзаметку назіраюць усе — ад машыністкі да рэдактара. Што ж, так заўсёды бывае: да навічка прыглядаюцца, хочуць ведаць, чаго ён варты... Чаго ж варты я?*

**І. ПАТАПАЎ,**
**студэнт III курса аддзялення журналістыкі.**

# Тыдзень у Львоўскім універсітэце

## У нашых сяброў

*З сакратаром камсамольскага бюро філалагічнага факультэта Вадзімам Каўтуном мы знаёмы не больш, як гадзіну, а ўжо ходзім нібы даўнія сябры, па Львове, размаўляем. Я расказваю пра наш універсітэт, пра Мінск, пра беларускія навабудоўлі. Вадзім— пра свой горад, пра ўніверсітэт.*

*— Сёлета ў нас вялікае свята. Увосень—300 год з дня заснавання ўніверсітэта спаўняецца, — з гонарам паведамляе ён. Потым дадае:*

*—У ім вучыўся і наш вялікі Іван Франко... Дарэчы, нядаўна мы арганізавалі кабінет франказнаўства. Хочаш паглядзець?— раптам прапаноўвае мне Вадзім.*

*— Безумоўна, — кажу я. Тым больш, што ўжо паціху пачынаюць ныць ногі. І не дзіва: нямала пахадзілі мы па горадзе, агледзелі Холм Славы, на якім у знак удзячнасці савецкім воінам-вызваліцелям Львова гарыць вечны агонь; пахадзілі па могілках, дзе пахаваны нястомны Камяняр — Іван Франко, які заклікаў «крышыць скалу» — аўстрыйскую імперыю; узбіраліся па вузкай лесвіцы на высокі замак — месца, з якога, як на далоні, відаць амаль увесь горад.*

*Адзінаццаць факультэтаў, якія маюцца ў Львоўскім дзяржаўным універсітэце імя Івана Франко, размяшчаюцца ў двух прасторных будынках. Вучэбнай плошчы поўнасцю хапае. Кафедра ўкраінскай літаратуры, напрыклад, займае тры пакоі. Кабінет франказнаўства, куды прывёў мяне Вадзім, — два.*

*У гэтым кабінеце мне паказваюць рэдкія выданні кніг Івана Франко, кнігі пра творчасць палымянага паэта-патрыёта, фотакопіі дакументаў, фатаграфіі.*

*— А цяпер паглядзім яшчэ нешта, — запрашае мяне Вадзім далей. Уваходзім у прасторную залу. Сцены распісаны ілюстрацыямі з твораў Тараса Шаўчэнкі, на пярэднім плане партрэт вялікага кабзара. Стаіць некалькі скульптур таго, хто больш чым сто гадоў назад прадбачыў, што «царя не будет супостата, а будуть син и буде мати и будуть люди на землі».*

*—Гэта шаўчэнкаўская аўдыторыя,—паясняе Вадзім.— У ёй будуць чытацца спецкурсы па творчасці класіка нашай літаратуры, адбывацца пасяджэнні навуковых гурткоў, праводзіцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі, дыспуты. Гэтую аўдыторыю да 100-годдзя з дня смерці паэта стварылі. Рэктарат дзесяць тысяч грошай выдзеліў, каб абсталяваць яе,—і ўжо неяк па-смешнаму таямніча Вадзім дадае:*

*— Рэктар у нас па спецыяльнасьці геолаг, але ў душы сапраўдны філолаг.*

*Да нас падыходзіць загадчыца кабінета франказнаўства і шаўчэнкаўскай аўдыторыі. Калі яна даведалася, што я з Мінска, гаворыць:*

*— У Львове няма ніякіх кніг на беларускай мове. А нас цікавяць даследванні беларускіх літаратуразнаўцаў. Творчасць Франко і Шаўчэнкі, сувязі нашых пісьменнікаў з Беларуссю, з беларускай літаратурай. Як добра было б наладзіць сувязь з кафедрай беларускай літаратуры вашага ўніверсітэта. Мы, у сваю чаргу, высылалі б тое, што цікавіць вас...*

*Мяне, як госця, цікавіць усё: расклад заняткаў, спосаб выкладання, накал навуковага жыцця на факультэце. Па парадку пачынаю даведвацца, што ў Львоўскім універсітэце на ўсіх факультэтах, пачынаючы з трэцяга курса, уведзен дзень самастойнай працы. У гэты дзень кожны студэнт займаецца сваёй справай: адзін піша курсавую, або навуковую працу, другі— чытае праграмную літаратуру, трэці — наведвае гурток або выконвае грамадскае даручэнне.*

*— Гэты дзень нам вельмі дапамагае, — гаворыць Вадзім. — А то ўвесь тыдзень так загружаны, што нават да практычных заняткаў няма часу падрыхтавацца.*

*У адной з аўдыторый чуваць галасы.*

*— Нашы навукоўцы дыспутыруюць, —усміхаецца мой новы сябра.*

*«Навуковец» па-украінску — член СНТ. Слова вельмі трапнае! Нядрэнна, магчыма было б запазычыць яго і ў беларускую мову. Тым больш, што гэтае падпарадкоўваецца ўсім нормам і правілам нашай мовы і этымалогія яго лёгка ўкладваецца. Але справа не ў слове, а ў людзях. Навукоўцаў у Львоўскім універсітэце шмат. У прыватнасці, на філфаку амаль кожны год выдаюцца зборнікі студэнцкіх работ.*

*А сёлета арганізаваўся тут яшчэ адзін гурток — кібернетыкі. Члены гуртка вывучаюць «думаючыя» электронныя машыны, каб з іх дапамогай перакладаць тэксты з адной мовы на другую, складаць шыфры для бібліятэчных кніг і інш. Пазней адзін з гуртkoўцаў мне расказаў, што год назад многія не верылі ў мэтазгоднасць такога гуртка, баяліся нават думкі—спалучыць філалогію з матэматыкай. Цяпер жа ўжо нават існуюць аддзяленні матэматычнай лінгвістыкі на філалагічных факультэтах Маскоўскага, Ленінградскага і Кіеўскага ўніверсітэтаў.*

*Калі мы з Вадзімам ішлі па калідору, да нас падышоў высокі мужчына.*

*— Я даведаўся, што вы з Беларусі. Давайце пазнаёмімся,— і ён працягнуў мне руку.—Іван Аксенцевіч Дзенісюк.*

*Разгаварыліся. Іван Аксенцевіч — выкладчык украінскай літаратуры. Ён таксама цікавіцца беларускай мовай і літаратурай. З сучасных беларускіх пісьменнікаў Дзенісюк больш за ўсё любіць творы выкладчыка нашага ўніверсітэта Івана Навуменкі, з якім ён трымае перапіску.*

*— Вы яшчэ ўбачыце, з якой цеплынёй у нас адносяцца да беларусаў, да беларускага слова, —гаворыць Іван Арсенцевіч на развітанне.*

*І сапраўды. У час знаходжання ў Львове мае ўкраінскія сябры часта прасілі, каб я на беларускай мове чытаў вершы, кнігі ці проста — гаварыў па-беларуску. А пасля гэтага кожны раз раздаваўся вокліч, які кожнаму беларусу прыемна чуць: «Яка гарна беларуська мова!»*

*У Львове я пражыў тыдзень. Чытаў даклад на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня смерці Тараса Шаўчэнкі, выступіў на адкрыцці піянерскага інтэрнацыянальнага клуба, знаёміўся з горадам і ўніверсітэтам. Але час і дахаты. Развітваючыся, запрашаю маіх сяброў прыехаць на нашу навуковую канферэнцыю, якая адбудзецца ў красавіку, а пазней, у кастрычніку, — на святкаванне 40-годдзя нашага ўніверсітэта.*

*—Не забудзьце, што і ў нас сёлета гэтакае свята, — гавораць яны.*

*— Не забудуся. Да пабачэння, другові!*

*— Да пабачэння! — адказваюць мне па-беларуску.*

**В. РАГОЙША,**
**студэнт III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

**Львоў—Мінск.**

РЭПЛІКА

# АБ'ЕКТЫВУ НЕ ХАПІЛА АБ'ЕКТЫЎНАСЦІ

«..І вось я фотарэпарцёр, — заяўляе Зоркі ў газеце «Пражэктар» — органе студкома ў інтэрнаце па вуліцы Свярдлова— і тут жа шматабяцаюча дадае:— З гэтага нумару я буду рэгулярна на яе старонках».

Любімым жанрам Зоркі абраў фотаэцюд. У апошнім нумары «Пражэктара» ён і змясціў некалькі сваіх «твораў».

На адным са здымкаў мы бачым юнака на лесвіцы і дзяўчыну. Сваю творчую няўдачу аўтар тлумачыць так: «Я сумысля не здымаў твар дзяўчыны, бо разлічваў, што яго залье чырвань».

Чытача, які прабягае вачыма радкі тэкста, сапраўды кідае ў чырвань, толькі не за маладых людзей на здымку, а за самога рэпарцёра, які з першых жа крокаў супрацоўніцтва ў «Пражэктары» падводзіць газету.

Паказваючы на муху і ледзь не б'ючы сябе кулаком у грудзі, Зоркі сцвярджае: гэта слон. Свой фотаэцюд аўтар сенсацыйна назваў: «Каханне на лесвіцы ў дзве-тры гадзіны ночы». Аднак вядома, што здымкі рабіліся ў 23 гадзіны 18 мінут. Што гэта так — спытайце ў студэнткі другога курса аддзялення журналістыкі Раісы Новікавай і студэнткі трэцяга курса рускага аддзялення Лідзіі Шрамко, якія стаялі і размаўлялі ў гэты час на лесвіцы. У дзве-тры гадзіны ночы гераіня фотаэцюда Шура Н. бачыла ўжо, мабыць, дзесяты сон. Гэта таксама могуць пацвердзіць усе жыхары пакою № 105, дзе жыве абвінавачваемая.

Ведаю, абураны аўтар пачне апраўдвацца:

— Усё роўна я праў! Пабочны наведвальнік затрымаўся ў інтэрнаце аж на цэлых 18 мінут пасля адзінаццаці гадзін.

Тады прыпомнім: прыведзены факт меў месца 19 (а не 20) сакавіка, якраз у дзень выбараў у мясцовыя Саветы. У гэты дзень свята на ўсіх выбарчых участках працягвалася да поўначы. Дзверы тысяч агітпунктаў для ўсіх выбаршчыкаў, у тым ліку і для маладога чалавека, які трапіў у аб'ектыў фотаапарата, былі адчынены да 24 гадзін...

Міжволі ўсмешку чытача выклікае і трэці фотаэцюд, дзе сфатаграфавана здзіўленая студэнтка 5 курса філфака Тамара Дземянцей ля лесвіцы. Да фотаздымка зроблен надпіс: «Яна вельмі спакойна пазіравала перад фотаапаратам і нават фотакартку папрасіла». (?!). Зоркі ахвотна паведамляе гэты факт. А дзе ж самая простая і такая патрэбная павага да дзяўчыны, дзе такт, неабходны журналісту?

Аўтар паведамляе, як ён вялікадушна падараваў ёй здымак і напісаў: «На нядобры ўспамін аб тым, чаго не павінна быць у інтэрнаце пасля адзінаццаці гадзін». Як павучальна і разумна! Як гэта міла!

Цікава, за што ж абвінавачвае фотарэпарцёр студэнтку Дземянцей? Толькі за тое, што пасля адзінаццаці гадзін спаткаў яе на лесвіцы?! Дык што ж рабіць у такіх выпадках тым, хто любіць да гадзіны ночы і пазней затрымлівацца ў ленпакоі інтэрната?

І ўвогуле, няўжо Зоркі не змог знайсці фактаў, аб якіх сёння трэба было не гаварыць, а крычаць ва ўвесь голас. Навошта яму было рабіць балюча тым, хто гэтага не заслугоўвае, навошта было зневажаць людзей. А калі пачынаючы аўтар сапраўды агрэсіўна настроены супраць кахання, то няхай яго аб'ектыў у першую чаргу будзе накіраван супраць тых, хто не варты гэтага высокага пачуцця.

# Фізкультура і спорт

**Барацьба працягваецца**

Сёлета круглагадовая універсітэцкая спартакіяда праводзіцца па 22 відах спорта. Даўно выявіліся мацнейшыя лыжнікі, закончылі барацьбу шахматысты, прадстаўнікі «маленькай ракеткі» і нават «каралевы спорту»—лёгкай атлетыкі. Сёння мы расказваем аб спаборніцтвах, якія закончыліся на гэтым тыдні.

## НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ— МАТЭМАТЫКІ

Каманднае першынство універсітэта па шашках аспрэчвалі шэсць факультэтаў. Розыгрыш праводзіўся ў два кругі, прычым улічваліся ачкі, якія былі набраны ў абодвух кругах.

У першым крузе фізікі набралі на пяць ачкоў больш, чым матэматыкі. Апошнія значна ўзмацнілі склад сваей каманды ў другім крузе. За каманду матэматыкаў выступілі шматразовы чэмпіён БССР майстар спорту М. Гелер, чэмпіёнка рэспублікі Л. Лесіна, першаразраднікі С. Розін, А. Абрамовіч, Я. Кухарчук, Н. Лепяшынскі, Ю. Струк і іншыя. Матэматыкі ўпэўнена выйгралі сустрэчы ў юрыстаў, гісторыкаў, хімікаў і філолагаў і, набраўшы ў чатырох сустрэчах 23,5 ачка, атыгралі ў фізікаў адно ачко.

Фізікі перамагалі з не менш буйным лікам. Перад апошнім турам яны былі ўперадзе матэматыкаў на чатыры ачкі, але апошнія не гублялі надзеі і выйгралі ў фізікаў з лікам 6:1. Адзінае ачко фізікам прынесла Бадзяка.

Усе сустрэчы выйгралі ў турніры М. Гелер, Л. Лесіна. Матэматыкі сталі чэмпіёнамі універсітэта.

На другім месцы—каманда фізічнага факультэта. Трэба адзначыць узрастаючае майстэрства Паўлава (філфак), Стуканава (гістфак), Койфмана і Кісялёвай (юрфак), Гуркова і Солдака (фізфак), Абрамовіча (матфак).

**Г. ДРАБУШЭВІЧ.**

## І ПЕРАМОЖЦАЎ СУДЗЯЦЬ

Турнір у валейбалістаў закончан, усё стала на свае месцы. У мужчын каманды раздзяліліся з самага пачатку на тры групы. Характэрна, што першую групу саставіла ўсяго... адна каманда. Гэта фізікі, якія ўжо пасля першых сустрэч паказалі, што яны на галаву вышэй за сваіх супернікаў. Другую ж саставілі адразу некалькі каманд—матэматыкі, філолагі і інш., якія маглі весці барацьбу толькі за другое—трэцяе месцы. Так і не «знайшлі сябе біёлагі. Не дзіва: каманда, скамплектаваная перад самым пачаткам гульні, не прынясе добрых вынікаў...

Каманда фізічнага факультэта, ў складзе якой выступалі Ю. Шумілаў, І. Таруцін, М. Сасімовіч, В. Максіменка, А. Фядотаў, Р. Шлапакоў, А. Карлукоў, Д. Смаршчок, С. Сягал, П. Краўцоў і В. Валькові, закончыла турнір без паражэнняў, набрала 7 ачкоў і заняла першае месца. Заслужаны поспех!

Каманда гуляе дружна, мае добры арсенал тэхнічных прыёмаў. У нападзенні асабліва вылучаюцца Сасімовіч, Таруцін, у абароне—Шумілаў.

Аднак і фізікі здольны губляцца ў адказны момант. Доказ гэтаму — гульня з філолагамі. Першую партыю фізікі выйгралі лёгка, другую лёгка здалі філолагам. У трэцяй гульня ішла ачко ў ачко і толькі перавага ў два мячы дала перамогу фізікам. Недапушчальны промах! Каманда заўсёды павінна паказваць байцоўскія якасці. Калі б філолагі праявілі больш старання і настойлівасці, лік мог быць другім, нават у іх карысць. Добра гулялі ў філолагаў А. Кукевіч і В. Харавец. Каманда набрала пяць ачкоў і толькі суадносіны партый (12:5) далі ёй трэцяе месца. Валейбалісты філфака ў апошні час ні разу не падымаліся так высока.

На другім месцы матэматыкі, у іх таксама 5 ачкоў, але лепшыя суадносіны партый (12:4).

У дзяўчат прыемнае выключэнне прадстаўляе каманда біялагічнага факультэта. Аднак і яна гуляла не заўсёды роўна. І зноў паказальны іх вынік з філолагамі, якія знаходзяцца ў аўтсайдэрах, займаючы 7 месца. Каманда недацаніла сваіх сапернiц і ледзь не прайграла. Філолагі вялі і ў першай, і ў другой партыях з лікам 9:3, 10:6—і усё ж прайгралі. Што зробіш, калі не хапіла вопыту, калі каманда нервуецца. Адсюль — больш трэніравацца, смялей гуляць, вывучаць тэхніку і прыёмы.

Біёлагі набралі 7 ачкоў. Яны— чэмпіёны.

Другое месца з шасцю ачкамі занялі студэнткі матфака. На трэцім месцы гісторыкі—5 ачкоў.

**Наш спартыўны аглядальнік.**

*Звярніце ўвагу!*

## По прагаме двух універсітэтаў

*Кіраўнікі і удзельнікі мастацкай самадзейнасці ўніверсітэта клапоцяцца аб эстэтычным выхаванні студэнтаў другога курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.*

*Якія гэта чулыя людзі! Разумеюць, што працаваць і вучыцца цяжка, што нам вельмі цяжка знайсці час на наведванне тэатраў і канцэртных залаў. І вось прама перад нашай аўдыторыяй або ў суседняй сталі праводзіцца рэпетыцыі хору і танцавальнага калектыву.*

*У мінулым годзе студэнты нашай і суседніх груп праслухалі рэпертуар харавой капелы. У гэтым навучальным годзе праграма ўніверсітэта культуры будуецца так, каб мы мелі магчымасць пазнаёміцца з танцавальным мастацтвам народаў СССР, краін Бліжняга і Сярэдняга Усходу і г. д. Вось, напрыклад, урокі англійскай мовы, лекцыі па тэхніцы афармлення газеты і іншыя праходзяць пад гукі танцавальнай сюіты «Бульба».*

*Нядаўна наша група прыняла рэзалюцыю: «Мы, слухачы своеасаблівага ўніверсітэта культуры, праслухаўшы, яго двухгадовую праграму, адзначаем:*

*1. Мы не маем магчымасці засвоіць такую вялікую праграму двух універсітэтаў.*

*2. Таму просім кончыць далейшае выступленне пад нашымі дзвярыма».*

*Так будзе лепш.*

**І. РЭЗНІК,**
**студэнт 2-га курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31.
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецтва
БДУ імя У. І. Леніна.

АТ 06382. Зак. 1009.